тэхналагічныя прыёмы навучання: экстраактыўны, інтэрактыўны, інтраактыўны, самастойная (пазааўдыторная) работа.

**Summary**

**On Some Structural Elements and Technological Means of Teaching the Belarussian Language at Speciality Faculties**

**Shlyk I.M.**

An important step in reforming educational process is to use active methods of teaching. Teachers not only give students certain knowledge but help them to use it in their professional activity and stimulate creative abilities of students.

Key words: forms of practical lessons; debates; method of concrete situations; business games; role training; technological means of teaching; extraactive; interactive; intraactive; individual work.

УДК 378.016 : 811.161.3

# МОЎНЫ ТЭСТ ЯК ВЫНІКОВАЯ ФОРМА КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ СТУДЭНТАЎ

**Садоўская З.Я.**

УА "Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт"
г. Гродна Рэспубліка Беларусь

Усім вядома, што цэнтралізаванае тэсціраванне па беларускай і рускай мовах з'яўляецца абавязковай умовай пры паступленні ў вышэйшыя навучальныя ўстановы Рэспублікі Беларусь. Тэстам цяпер надаецца вялікая ўвага яшчэ ў школе. Сённяшнія студэнты добра знаёмы з гэтай формай апытвання, і няма неабходнасці траціць многа часу на тлумачэнне іх выканання, таму мы таксама даволі часта звяртаемся да гэтай формы кантролю, бо тэсты з'ўляюцца не толькі надзейным сродкам выяўлення ведаў і ўменняў студэнтаў, развіваюць здольнасць самастойнага даследавання, але і эканомяць час, які прыходзілася траціць на калоквіумы, пісьмовыя кантрольныя работы і індывідуальныя апытванні.

У праграму беларускай мовы ВНУ ўваходзяць тэмы: "Мова і соцыум", "Гістарычныя этапы фарміравання і развіцця беларускай мовы", "Праблемы беларуска-рускай інтэрферэнцыі", "Лексіка і лексікаграфія", "Асаблівасці навуковага стылю", "Беларуская навуковая тэрміналогія", "Стылістыка афіцыйна-справавых папер", але магчымасці для разгляду гэтых пытанняў неаднолькавыя. Не вельмі многа часу адводзіцца для разгляду такога важнага пытання як "Гітарычныя этапы фарміравання і развіцця беларускай мовы". Хаця ўсім вядома, што адукаваны чалавек павінен ведаць гісторыю свайго народа, карані сваёй мовы. Вывучэнню



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

гэтага пытання надаецца пэўная ўвага і ў школе, і ў ВНУ ў час вывучэння курса “Гісторыя Беларусі”, але разгляд станаўлення і шляхоў развіцця беларускай мовы, разумення яе сутнасці, ролі мовы ў жыцці грамадства - гэта ўжо задача выкладчыкаў мовы. Часу на разгляд гэтых пытанняў адводзіцца няшмат. І, каб не марнаваць яго на доўгае апытванне або пісьмовыя праверкі, мэтазгодна прапанаваць студэнтам кантрольны тэст, які дасць ім магчымасць за кароткі тэрмін часу паказаць сваё веданне гісторыі мовы. У час праверкі ведаў выкарыстоўваюцца тэсты, якія будуюцца з улікам ведаў і па гісторыі Беларусі, і па гісторыі мовы.

1. Усходнія славяне ўпамінаюцца ў пісьмовых крыніцах як:

а) венеды; б) славены; в) анты.

2. На тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага існаваў білінгвізм:

а) беларуска-польскі; б) беларуска-рускі; в) беларуска-царкоўнаславянскі.

3. Назва “белорусский язык” пачала ўжывацца ў:

а) ВКЛ; б) Расійскай Імперыі; в) Рэчы Паспалітай.

4. Якую назву мела першая надрукаваная кніга Ф.Скарыны?

а) “Псалтыр”; б) “Апостал”; в) “Юдзіф”.

5. Як з грэцкай мовы на беларускую перакладаецца слова “біблія”?

а) мова; б) рэлігія; в) кнігі.

6. Аўтар кнігі “Апраўданне грэшнага чалавека перад Богам”;

а) В.Цяпінскі; б) С.Будны; в) Л.Сапега.

7. Назавіце кнігу Васіля Цяпінскага, выдадзеную паралельна на царкоўнаславянскай і беларускай мовах:

а) “Евангелле”; “Катэхізіс”; “Апостал”;.

8. Беларуская мова была выведзена з афіцыйнага ўжытку ў:

а) 1696г.; б) 1795г.; в) 1840г..

9. Царскі ўрад выдаў закон аб свабодзе друку ў:

а) 1900г.; б) 1905г.; в) 1907г..

10. Аб кім ідзе гаворка ў гэтым тэксце?

Нарадзіўся на Гродзеншчыне, у сям’і настаўніка. Лінгвіст і літаратар, этнограф і фалькларыст, гісторык і бібліёграф, педагог, аўтар звыш 700 навуковых прац у галіне філалогіі. Адзіны з беларусаў, хто атрымаў у дарэвалюцыйны час званне акадэміка Пецярбургскай Акадэміі навук у галіне філалогіі, рэктар Варшаўскага універсітэта, прафесар Петраградскага універсітэта.

11. Аб кім ідзе гаворка ў гэтым тэксце?

Беларускі мовазнавец, фалькларыст і этнограф. Працаваў настаўнікам, інспектарам, загадчыкам духоўных і дваранскіх вучылішчаў у Магілёўскай, Віленскай і Мінскай губернях. Аўтар прац “Беларускія прыказкі і прымаўкі” (1852), “Беларускія песні” (1873), “Слоўнік беларускай мовы” (1870).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

12. Аб кім ідзе гаворка ў гэтым тэксце?

Беларускі мовазнавец-славіст, паліглот, валодаў усімі славянскімі мовамі, малдаўскай, румынскай, італьянскай, нямецкай, англійскай, французскай, грэчаскай і інш., педагог. У 1926-30 г.г. загадчык дыялекталагічнай камісіі Інбелкульта. Стварыў першы дыялекталагічны атлас беларускай мовы.

13. Трохтомная праца “Беларусы” была створана:

а) Я.Карскім; б) І.Насовічам; в) Б.Тарашкевічам.

14. Вялікім укладам І.Насовіча ў развіццё беларускай мовы з’яўляецца:

а) “Беларусы”; б) “Слоўнік беларускай мовы”; в) “Беларуская граматыка”.

15. Якое легальнае беларускамоўнае выданне існавала ў 1906-15г.г. у Вільні?

а) “Наша доля”; б) “Наша ніва”; в) “Гоман”;.

16. “Беларуская граматыка для школ” Б.Тарашкевіча ўпершыню была надрукавана ў: а) 1917г.; б) 1918г.; в) 1921г..

17. У 1926г. была праведзена Акадэмічная канферэнцыя па рэформе:

а)фанетыкі і акцэнтуацыі; б) марфалогіі і сінтаксісу; в) беларускага правапісу і азбукі.

18. Назавіце гады рэформы беларускай мовы ў савецкі час.

19. Закон “ Аб мовах у Беларускай ССР” быў прыняты ў:

а) 1989г.; б) 1990г.; в) 1991г..

20. У якім годзе адбыўся рэферэндум, па выніках якога другой дзяржаўнай мовай стала руская?

З улікам таго, што на Беларусі вялікі ўплыў мае інтэрферэнцыя, у выкладанні курса значная ўвага надаецца супастаўленню і выяўленню адрозненняў беларускай і рускай моў. У час заняткаў па праблемах беларуска-рускай інтэрферэнцыі выконваюцца заданні, якія фарміруюць практычнае прымяненне дзвюх моў. Для праверкі ведаў, уменняў і навыкаў па праблемах інтэрферэнцыі таксама мэтазгодна прапанаваць тэсціраванне. Але ў адрозненні ад тэставых заданняў да тэмы “Гістарычныя этапы фарміравання і развіцця беларускай мовы”, дзе трэба было назваць толькі адзін правільны адказ, у тэстах па тэме “Праблемы беларуска-рускай інтэрферэнцыі” правільных адказаў можа быць два і болей.

Вось некаторыя з тэставых заданняў:

1. Адзначце словы, дзе дапушчана словаўтваральная інтэрферэнцыйная памылка:

| | |
|---|---|
| а) творчаства | в) азярко |
| б) прароцтва | г) дзецкі |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

2. Адзначце словы, дзе дапушчаны памылкі ва ўжыванні формы ліку:

а) варота  в) крупа

б) акуляры  г) драва

3. Адзначце памылкі ў словазлучэннях з формамі ступеняў параўнання:

а) суніцы смачней за брусніцы;

б) мая мама прыгажэй усіх;

в) здароўе мілейшае за грошы;

г) росы ярчэй серабра.

4. Адзначце памылкі ва ўтварэнні дзеепрыметнікаў:

а) прывезенныя  в) расказаны

б) распусціўшыяся  г) зжаты

Тэсты дапагаюць прасачыць за самім працэсам засваення кожным студэнтам асноўных фактаў, паняццяў, тэрмінаў, а значыць, больш дзейсна ўплываць на моваэнаўчую адукацыю студэнтаў.


**Рэзюмэ**

Тэсты як форма кантролю трывала ўвайшлі ў наша жыццё. Яны шырока выкарыстоўваюцца ў прамысловасці і медыцыне, псіхалогіі і адукацыі. Тэсціраванне – гэта навукова абгрунтаваная методыка, якая дазваляе на розных этапах навучання дастаткова аб'ектыўна вызначыць узровень ведаў. Тэсты дапагаюць студэнтам і выкладчыкам не проста зафіксаваць поспех ці няўдачу, але і зразумець іх прычыну. Загадзя запланаванае і своечасова абвешчанае тэсціраванне скіруе студэнтаў на ўважлівае вывучэнне і глыбокае асэнсаванне як абавязковай, так і дадатковай літаратуры.

Ключавыя словы: тэст, форма кантролю, методыка навучання, узровень ведаў, уменняў і навыкаў.



**Summary**

**Language Test as a Final Form of Knowledge Control**

**Sadovskaya Z.E.**

Test as form of control have become an important part of our life. They are widely used in industry and medicine, psychology and education.

Testing is a scientifically-proved method with the help of which one can find out the basic level of knowledge and skills at different stages of studying.

Tests help students and tutors not only to realize the success or failure but to understand their reason.

Planned and announced beforehand tests enable the students to study attentively both compulsory and additional literature.

Key Words: test, form of control, methods of teaching, level of knowledge, skills




РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ